пражываньня кіназоркі альбо рок-сьпевакі. Гэта, вядома, перабольшаньне, але ў ім ёсьць рацыянальнае зерне. Цяжка адшукаць у Беларусі чалавека, які не назваў бы двух-трох майстроў нашай *паэзіі*. У той самы час лёгка адшукаць таго, хто блытае Купалу і Коласа альбо ніколі ня чуў пра Алеся Гаруна ці Макара Краўцова.

У той самы час, ня кожны зацяты саветчык назаве імя аўтара БССРаўскага гімну Міхася Клімковіча, гэтак сама як зацяты камуніст ня ведае, што ягоны партыйны гімн „Інтэрнацыянал" ёсьць у беларускім перакладзе таго самага Купалы.

*Паэта*, *паэтка*, *паэзія*, *паэтычны*, *апаэтызаваны*. Усе яны маюць аднога грэцкага продка — слова *поітіс*, што больш-менш адпавядае нашаму *пясьняр*.

# Пекла

***Міхась Скобла***

У 1937 годзе рыхтавалася чарговае пісьмо Сталіну ад савецкага народу. На гэты раз правадыру білі чалом беларусы. Але іхнае прызнаньне пад пільным вокам выдавала на дывэрсію: на вялікай чырвонай кнізе золатам было выціснута „Вялікаму Сталіну ад беларускага народу". Адпаведныя службы сьцямілі, што загаловак будзе чытацца ў Маскве, і ў саюзную сталіцу „*ад*" беларускага народу не паехаў. Паехаў „от", дзеля якога ўвесь эпічны ліст працоўных быў перакладзены на расейскую мову.

Так бацька народаў і не зазнаў нашага *пекла*, напісанага шасьма паэтамі і падпісанага двума мільёнамі грамадзянаў савецкай Беларусі.

Пакуль ліст выдрукавалі 20-тысячным накладам, двое з аўтараў і тысячы падпісантаў ужо сядзелі. Кожны *пякельнаю* працаю ў кар'еры ці на лесапавале набліжаў прыйсьце камуністычнага раю, кожнага ганялі як Марку па *пекле*..

Геенаю вогненай, дзе гаспадарыць пачварны Люцыпар з паплечнікамі-*пякельнікамі*, палохалі дзяцей і пужаліся самі. Людзі казалі: „*Хто курыць — таго да пекла тураць, а хто нюхае — той сам да пекла трухае*".

Адна вясковая бабулька называла могілкі раем і пра пярэбары пад вечныя сосны казала з палёгкай. А ўсё таму, што жыцьцё падавалася ёй сапраўдным *пеклам*..

Хапала *пеклаваньня* ў жыцьці. Ці не таму беларусы з асэнсаваньнем *пекла* ў мастацтве трохі прыпазьніліся.

Толькі ў 90-ыя гады прачыталі па-беларуску Дантава *пекла*, а мастак Алесь Пушкін намаляваў сваё *пекла* на сьценах царквы ў родным мястэчку Бабры. Вернікі засталіся задаволеныя і Таемнай Вячэрай, і выявамі апекуна храма сьвятога Міколы Цудатворцы. А вось вялікая фрэска, на якой паказаны Страшны Суд, выклікала ў настаяцеля царквы пэўную насьцярогу, дакладней, фрагмэнт фрэскі, дзе ў *пекле* ў адпаведнай кампаніі апынуўся чалавек — лысы, вусаты ды пры гальштуку. Той самы, што называе сябе праваслаўным атэістам.